# Вобразы мілыя роднага краю



## Напярэдадні 140-годдзя класіка айчыннай літаратуры «Беларуская думка» адправілася ў падарожжа па коласаўскіх мясцінах. Далучайцеся!

**Хораша быць у дарозе пахмурным, але мяккім і ўтульным восеньскім днём. За акном аўтамабіля, над іржавай жаўцізной прыбраных ніў то збягаюцца, то разыходзяцца аблокі. Думкі светлыя, натхнёныя – усё ж такі кіруем да Коласа, у яго родныя мясціны.**

### Акінчыцы: моц прадметаў

Гэта адна з чатырох мемарыяльных коласаўскіх сядзіб на Стаўбцоўшчыне. Менавіта ў Акінчыцах 140 гадоў таму Ганна Юр’еўна Міцкевіч, народжаная Лёсік, у лесніковай хатцы дала жыццё свайму трэцяму сыну, будучаму народнаму паэту Беларусі.

Сустракае нас загадчык музейнага філіяла «Мікалаеўшчына» Яўген Шавель. Пра наш прыезд яго загадзя папярэдзіла Ірына Мацяс, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. І ўсё ж Яўген Іванавіч выглядае крыху напружаным, чамусьці нервуецца.

– Пачакайце, зараз прыйдзе жонка, яна ўсё пакажа, – гаворыць ён нам.

Прычына яго заклапочанасці высветлілася хутка. Стоўбцы – сталіца сёлетніх абласных «Дажынак» – рыхтаваліся да свята. І ў Акінчыцах, якія з 1977 года ў гарадской рысе, таксама кіпела праца: абнаўлялі сцежкі-дарожкі, рамантавалі агароджу.

Вось і Вольга Шавель, круглатварая жвавая жанчына, навуковы супрацоўнік філіяла і, як мы пераканаліся потым, выдатны экскурсавод. А спачатку яна быццам ледзяной вадой абліла:

– У сувязі з юбілеем рамонтныя работы амаль ва ўсіх сядзібах, так што ў Ласток не паедзем.

Шкада, бо якраз у Ластку (і больш нідзе ў коласаўскіх мясцінах) захавалася хата, якую пабудавалі ў 1885 годзе. Тут Колас правёў свае раннія дзіцячыя гады.



**«Дзе льецца Нёман срэбраводны»**

– Дрэва трэба паднаўляць, апрацоўваць ад шашаля ды мурашак, дом жа стаіць пасярод лесу. Прыязджайце 3 лістапада на «Каласавіны». Думаю, да таго часу Ласток адчынім, – суцяшае і абнадзейвае Вольга Шавель.

Акінчыцы калісьці былі засценкам з дзевяццю хацінамі і трыццаццю насельнікамі. Цяпер гэта, як мы ўжо згадвалі, мікрараён Стоўбцаў. Тут пасля чарнобыльскай катастрофы знайшлі прытулак недзе паўтысячы сем'яў перасяленцаў з Нараўлянскага раёна. Напэўна, Колас ухваліў бы такую гасціннасць. Сам ён улетку 1940 года, калі ад раптоўнага пажару згарэла амаль уся Мікалаеўшчына, ледзь са скуры не вылузаўся, стараючыся дапамагчы землякам. Вёску адбудавалі – ды так, што гаспадары ацалелых хат па-добраму зайздросцілі пагарэльцам. Паэт заўсёды даваў грошы, калі ў яго знаёмых хварэлі дзеці ці здаралася якая іншая бяда. Прычым на прапанову вярнуць пазыку звычайна адказваў: «Вялікі дзякуй! Ні я, ні мае сыны ні ў чым не маем патрэбы. Калі буду бедны і хворы, тады дапаможаце».

Акінчыцкая лясная камора – першае месца працы Міхася Казіміравіча Міцкевіча, бацькі Коласа – была часткай вялікай разгалінаванай імперыі Радзівілаў. Князь Фларыян, палюючы ў тутэйшых лясах у кампаніі курфюрста брандэнбургскага, здзівіўся, што сяляне высякаюць лес і не плацяць за яго. Мяркуючы спагнаць з іх грошы, загадаў пабудаваць тут лясную заставу. Лесніком прызначыў збяднелага шляхціца Акінчыца. Месца выбраў стратэгічна выгаднае – на скрыжаванні Кацярынінскага гасцінца, што злучаў Крым з Санкт-Пецярбургам, і прасёлкавай дарогі ад Стоўбцаў на Мікалаеўшчыну. За паўвярсты, што таксама важна, працякаў Нёман.

Кожны з васямнаццаці леснікоў на службе ў Радзівілаў, апрача 40 рублёў гадавых (на гэтыя грошы можна было набыць чатырох коней), меў у часовым карыстанні ворную зямлю, хату і сенакос. Не дзіва, што займець такую пасаду лічылася вялікім шчасцем.

– Міхал быў служака па сваёй натуры, – расказвае Вольга Шавель. – Моцна трымаўся за гэту працу. Міцкевічы пражылі тут роўна два гады: з 1 красавіка 1881 года да 1 красавіка 1883-га. Разам з пасадамі змяняліся і месцы жыхарства.

***«Можна стаць на яго і загадаць жаданне – спраўдзіцца на сто працэнтаў, можаце праверыць».***

Сядзіба, якую мы бачым, пад'язджаючы да Акінчыц, – больш-менш дакладная копія. Яе адбудавалі ў 1982 годзе да стагадовага юбілею паэта. Тая хата, дзе нарадзіўся Якуб Колас, не захавалася.

Аднак сядзіба-рэпліка выглядае надта падобна на леснікову камору, што была тут 140 гадоў таму. Па-ранейшаму на скрыжаванні, і сёй-той нават заўважае тут сляды Кацярынінскага тракту. Крытая гонтам хатка з трыма невялікімі акенцамі, гумно з аборай пад саламянаю страхою, студня з жураўлём, прыгрэбнік, паркан з хваёвых плашчакоў – быццам машына часу пераносіць нас у канец XIX стагоддзя. Толькі наўрад ці быў такі агромністы і дагледжаны газон.

**«У глыбі двара стаяла хата…»**





«Дзе зачалася пуцявіна…»



«Я печ на рай не памяняю…»

– Якая ж маленькая хата! – дзіўлюся я.

– Дык і сям'я невялікая была! – усміхаецца наш экскурсавод. – Бацька Міхал Казіміравіч, маці Ганна Юр'еўна, старэйшыя сыны Уладзік і Алесь – месца акурат усім хапала! Кастусю пяць месяцаў было, як Міцкевічы з'ехалі адсюль.

Замест прыступак на ўваходзе плоскі камень.

– Гэта абломак жорнава, разбітага нямецкім снарадам, – тлумачыць Вольга Шавель. – Можна стаць на яго і загадаць жаданне – спраўдзіцца на сто працэнтаў, можаце праверыць. Бо што такое млын? Гэта хлеб, а хлеб – жыццё, таму жаданні спраўджваюцца.

Вочы хутка прызвычайваюцца да прыцемку ў хаце. У цэнтры – вялікая пабеленая печ.

– Яна ж галоўная ў хаце, – кажа Вольга. – Поіць, корміць, лечыць, саграве ды спальным месцам служыць.

Паводле якіх крыніц аднаўлялі коласаўскую печ?

– Чарцяжы знайшлі ў канцылярыі радзівілаўскай ардынацыі, дзе дакументацыя вялася на самым высокім узроўні. Бярэш у рукі паперу і адразу бачыш, напрыклад, што паміж гумном і хатай у Ластку раслі дзве грушы, адна з іх дажывала свой век.

Але, вядома, без творчай іскрынкі нават самыя падрабязныя чарцяжы не выратуюць.

– Рэстаўрацыю праектаваў архітэктар Аляксандр Канаваленка, зяць мастака Шчамялёва, – расказаў вядучы навуковы супрацоўнік аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага гістарычнага архіва, ганаровы архівіст Беларусі Уладзімір Дзянісаў. Ён жа аўтар разьбяных знакаў у філіяле «Мікалаеўшчына».

А прадметы ў Акінчыцах аўтэнтычныя, хаця далёка не ўсе з Коласавай сям'і. Збольшага гэта рэчы з сялянскага побыту канца XIX стагоддзя. Яны зусім як рукатворныя вырабы дзядзькі Антося, брата бацькі Якуба Коласа, які пражыў усё жыццё ў іх сям'і, дапамагаючы па гаспадарцы. Яго вобраз мо самы яркі ў «Новай зямлі».

***«Са школьных гадоў два творы ведаю на памяць – „Новую зямлю" і „Евгения Онегина". Іх не трэба завучваць: чытаеш – і адразу адкладваюцца ў галаве».***

Вось, напрыклад, гратка (прынёманскае дыялектнае слова, азначае шафку для посуду).

– Звычайна гратка з трох палічак, – тлумачыць Вольга Шавель. – Верхняя для збанкоў, у якія налівалі малако ці квас. Сярэдняя – для місак і відэльцаў. Лыжкі з вішнёвага дрэва, каб гарачыя стравы не пяклі рот. Гарначык – цукарніца, сплеценая з карэньчыкаў хвоі. І цукар з яе не сыпаўся, і суніцы з лесу траплялі дахаты. Сальнічка з бяросты – мо нават выраб дзядзькавых рук.



**«І ўжо пры печы з чапялою
Стаяла маці...»
На здымку: навуковы супрацоўнік
філіяла «Мікалаеўшчына» Вольга Шавель**

На ніжняй паліцы – кухонныя прылады і прыстасаванні. Найбольш цікавая з іх тарка, ці драчка, як дзе называюць. Бралі звычайны ліст жалеза і цвіком набівалі дзіркі. Ёсць калатоўка, старажытны міксер.

– У маладой хвоі ці елкі зразалі верхавіну, надта дбайна зачышчалі… Дзеткі звычайна пытаюцца: «Яна што, медная?» А я кажу: «Гэта такі вынік чалавечай працы, што яна так блішчыць».

Металічны бязмен, відавочна, не саматробны, а з нейкага вялікага кірмашу, што ладзіліся ў Рызе, Вільні і Міры. Вось біла – званочак карове на шыю. Наўрад ці яго выкарыстоўвалі ў Акінчыцах. Вольга Шавель кажа, што Міцкевічы на той час трымалі толькі свіней.

Тут кожны прадмет мае гісторыю і свае надзвычайныя вартасці, пра якія можна вельмі доўга расказваць.

– Гэткім чынам выкоўваўся інтэлект нацыі, – усміхаецца мая суразмоўца. – Хіба сялянам лёгка жылося? Не, няпроста. Таму думалі, як прыстасавацца, каб аблегчыць сваё жыццё.

У Коласавай «Новай зямлі» – бясконцае захапленне народнай вынаходлівасцю і кемлівасцю.

Вось саматканы ўзорысты ручнік – вядома ж, не з рук Ганны Юр'еўны, але яе вобраз, здаецца, нябачна лунае тут.

– Яна была выдатнай майстрыхай і сваіх чатырох дачок – Алену, Юзю, Маню і Міхаліну – навучыла ткаць такія цудоўныя рэчы, – запэўнівае нас навуковы супрацоўнік музейнага філіяла.

У глыбіні хаты саматканы дыванок, святочны абрус з прошвай з прыгожага бялёнага палатна, капа на ложку, пасцельная бялізна…

Сялянская ежа – святочная і будзённая.

Лапата для выпечкі хлеба.

– Распальвалася печ, под вымятаўся крылом для чысціні, лапата мачылася халоднай вадой і ўстаўлялася ў печ. Пах стаяў ні з чым непараўнальны! – настальгіруе Вольга Шавель.

Блінная дзяжа, услон, патэльня, апалонік – як ілюстрацыя да незабыўных Коласавых радкоў:

Дзень быў святы. Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне…

– Са школьных гадоў два творы ведаю на памяць – «Новую зямлю» і «Евгения Онегина», – чарговы раз здзіўляе наш экскурсавод. – Іх не трэба завучваць: чытаеш – і адразу адкладваюцца ў галаве.

Зрэшты, галоўны твор Якуба Коласа не пра Акінчыцы. Ён не памятаў і не мог памятаць гэты перыяд свайго жыцця, бо быў немаўляткам, але прызнаваўся пазней, што ў Акінчыцы яго цягне.

– Як у нас кажуць, дзе нарадзіўся, там пупавіну закапалі, – каментуе Вольга Шавель.

У цэнтры хаты падвешаная да столі калыска, раней яе называлі зыбачкай. Такая самая, як коласаўская.

– Як дзіця нараджалася, адразу яго ў пялюшку, ручкі-ножкі спавівачом скручвалі, і ляжала яно, як салдацік. Як у матулі рукі занятыя, дык гайдала люльку нагой дзякуючы спецыяльнаму прыстасаванню.

Тут жа бацькоўскі ложак. Сеннічок, падушкі, посцілка – усё саматробнае, прыгожае. Куфэрак з замком, дзе Міхал Казіміравіч нібыта хаваў ад сыноўсвавольнікаў службовую леснікоўскую дубальтоўку і патроны. Вялізны куфар для пасагу – калі ў Альбуцы ў 1891 годзе згарэла хата, дык Ганна Юр'еўна больш за ўсё шкадавала гэты куфар з яе дзявочым ткацтвам.

Пакуль мы з цікавасцю слухалі Вольгу Шавель, над гонтавым дахам леснічоўкі праліўся дождж – ды

такі зацяты, што калі не камень на ганку, ногі былі б па шчыкалаткі ў вадзе. А так, агледзеўшы прыгрэбак і сені, спакойна прайшлі да гумна, дзе таксама процьма розных цікавых прылад. І нават пабачылі, як разьбяры высякаюць драўляныя скульптуры паводле матываў Коласавых твораў. Іх паставяць паабапал дарогі ў Альбуць.

Дый нам самы час туды ехаць, пакуль распагодзілася. Падыходзіць Яўген Іванавіч і перасцерагае, што ў лесе грэйдзіруюць дарогу. Таму, кажа ён, альбо прыстройвайцеся за грэйдарам, альбо з'язджайце на абочыну і прапускайце.

А мы толькі рады! Яшчэ адна прыгода – зусім як у «Новай зямлі».

## Альбуць: моц прыроды

У дарозе, вядома ж, не маўчым.

– Муж у мяне тутэйшы, – расказвае Вольга Шавель. – Студэнтамі пазнаёміліся і вось ужо 40 гадоў жывём тут. Усё жыццё настаўнічала: гісторык па адукацыі, выкладала ў пачатковых класах у вясковай беларускай школе на Стаўбцоўшчыне.

– У музеі даўно?

– Два гады. Атрымліваю асалоду. А муж тры гады загадчыкам філіяла працуе. Раней быў дырэктарам школы.

– Ці шмат наведвальнікаў?

– Багата, дзеці і дарослыя. Сёлета шмат экскурсій з усіх куткоў Беларусі. Прыемна, што моладзь цікавіцца нашай культурнай спадчынай. Завітала да нас група веласіпедыстаў з Ленінградскай і Чалябінскай абласцей. Кажуць: «Ведите экскурсию по-белорусски». Потым пытаюся: «Ці зразумелі?» – «Поняли процентов на 95. Если б вы говорили по-русски, было бы не так эмоционально».

Мая суразмоўца перакanana, што пра Коласа трэба гаварыць па-беларуску:

– Ён усё жыццё быў зацятым абаронцам матулінай мовы. Выкладаў яе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, у Мінскім педтэхнікуме. Напісаў кнігу «Методыка беларускай мовы».

Рэдакцыйны аўтамабіль з'ехаў з шашы на вузкую грунтоўку. З абодвух бакоў стары сонны лес. Едзем па каляінах, а яшчэ ж недзе тут затаілася жудасная пачвара-грэйдар, якая толькі і чакае, каб не пусціць нас у Альбуць. І МАЗ насустрач ляціць. Неяк размінаемся.

А лес паўсюль чысты, высокі, грыбны. Класці асфальтаваную дарогу ці варта? Вось і грэйдзіруюць рэгулярна, інакш грунтоўка ў Альбуць, па якой едуць дзясяткі турыстычных аўтобусаў, ператворыцца з атмасфернага акцэнту ў непрыглядное месіва.

На паваротцы вялізны драўляны «Міхалаў крыж».

– У часы Коласа на гэтым месцы быў аднайменны засценак, а цяпер кампазіцыя самадзейнага разьбяра, – тлумачыць Вольга Шавель.

Завуць майстра Іван Супрунчык. Вакол крыжа – чатыры фігуры, якія сімвалізуюць розныя іпастасі чалавечага існавання. Адсюль пачынаецца «Шлях новазямельцаў» – адгалінаванне мастацкага комплексу драўляных скульптур «Шлях Коласа», дзе ўвекавечаны ў дрэве персанажы «Новай зямлі».

Паркуемся на лясной паляне. Далей пешшу. Неўзабаве да нас далучаецца наглядчык музейнай сядзібы Анатоль Копач.

***«Ён усё жыццё быў зацятым абаронцам матулінай мовы».***

– Чуеце грыбны пах, Анатоль Іванавіч? – павясковаму пытаецца Вольга Шавель. – Ці будуць грыбы? А то такая пяклень была.

– Грыбамі запахла, як пайшлі дажджы. Можа, будуць. Звычайна грыбоў тут дужа. А вясной якія водар! Ландышы, чаромха… А вось, бачыце, крынічка. Памятаеце ў Коласа?

Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка…

– Гэты год, як суш была, у нас крынічка высахла, – расказвае мужчына. – У часы Коласа крынічка была даволі глыбокая, і дзеці ў ёй купаліся. На Нёман бацькі іх не пускалі, баяліся.

Нёман літаральна за два крокі. Мо таму Колас у «Новай зямлі» называе Альбуць Парэччам? Але мы раку так і не ўбачылі. Колішні поплаў суцэльна зарос лесам, і сфатаграфаваць раку можна толькі з дапамогаю дрона. А даўней да самага Нёмана касілі траву.



«Дубы дзе дружнай чарадою
Стаяць, як вежы, над вадою...»



Саматужная аптэка ў Альбуцi

– Цераз крынічку ёсць масток, а ў тыя часы ляжалі жэрдачкі, па якіх у Альбуць траплялі людзі, а коні з вазамі пераходзілі ўброд, – гаворыць Вольга Шавель.

Крынічнае рэчышча густа зарасло зёлкамі.

Анатоль Іванавіч схіляецца і зрывае невялічкую цёмна-зялёную раслінку:

– Адчуваеце пах, ведаеце, што гэта? Дзікая мята. Як нацерціся ёю, дык ні камары, ні гізы не пакусаюць.

Цяпер Альбуць для мяне заўжды будзе пахнуць мятай.

– Давайце найперш завітаем да дубоў! – прапануе Вольга Мікалаеўна. – Пад адным з іх Колас напісаў свой першы верш «Вясна».

– Камароўская сказала, што пад гэтым! – рашуча ўказвае пальцам Анатоль Іванавіч.

Зінаіда Мікалаеўна Камароўская – шматгадовы былы дырэктар Коласаўскага музея, вялікі аўтарырэт ва ўсім, што тычыцца біяграфіі народнага паэта.

Але Шавель смяецца:

– Можна падумаць, што яна пры гэтым прысутнічала.

Дарэчы, менавіта Камароўская з тагачасным загадчыкам аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатолем Грэкавым прыдумалі насяліць філіялы драўлянымі скульптурамі, якія ў Альбуці на кожным кроку.

– Так, яны рупіліся пра гэта, – ці не ў голас кажуць мае спадарожнікі.

Яшчэ на ўваходзе нас сустракала скульптура «З раніцы ў нядзельку» з вобразамі дзяцей-новазямельцаў.

– Будзем ставіць яшчэ скульптуру матулі, – працягвае Вольга Шавель. – Але яе трэба выбраць з тых, што прапануюць самадзейныя мастакі.

– Я ўжо выбраў тую, у якой грудзі паболей, – жартуе Анатоль Іванавіч.

Па дарозе да дубоў сустракаем выяву дзядзькі Антося. Называецца «Догляд пчол». Сюжэт вельмі трапны, бо побач пасека, а дзядзька быў не толькі майстрам на ўсе рукі, але і дасканалым пчаляром.

Але ніякія скульптуры не параўнаюцца з Коласавымі дубамі.

– Дубы ў Альбуці раней стаялі па двое, бо Радзівілы падчас палявання накрывалі ў гэтай мясціне абедзенныя сталы, – расказвае Шавель.

Сувязь аднаго з другім я неяк не ўцяміла і не паспела ўдакладніць, як перад намі паўстаў сапраўдны волат.

– Бачыце, які?! Калі дзеткі да нас прыязджаюць, дык пяцёра не могуць яго абхапіць.

– Якія пяцёра? Сямёра дзяцей альбо пяць дарослых, – уносіць яснасць Копач.

Колькі ж гадоў дубу-асілку? Чатырыста? Пяцьсот?

– Калі Міцкевічы тут пасяліліся, гэтыя дубы ўжо былі велізарныя, – сцвярджае Вольга Шавель. – Сто гадоў для дрэва – гэта дзяцінства. Гэта ж не ліпа, якая ў такім узросце пачынае марнець. Нездарма ж і ў Купалы ў «Кургане» дуб – сімвал моцы.

– Апрача Коласавых дубоў, варта яшчэ і яблыні яго наведаць, – прапануе Анатоль Іванавіч. – Пакаштуйце – салодкія! З таго боку – антонаўка.

З'еўшы яблык, не ведаю, куды кінуць агрызак, такая чысціня навокал. Газон, дарожкі – як у дбайнай гаспадыні паркет.

***«Бачыце, які?! Калі дзеткі да нас прыязджаюць, дык пяцёра не могуць яго абхапіць».***

– А вось кедры. Нехта ж іх пасадзіў, – жартаўліва здзіўляецца наглядчык.

У Альбуці ёсць і маньчжурскі арэх, бо прыязджаюць дэлегацыі з усяго свету, прывозяць у дар свае расліны, каб ушанаваць памяць нашага слыннага паэта.

У Альбуці Міцкевічы пражылі чатырнаццаць гадоў, з 1890-га па 1904-ы. Вельмі насычаная і важная частка Коласавага жыцця.

– Адсюль Кастусь і старэйшыя браты хадзілі ў школу ў Мікалаеўшчыне. Адсюль у 1898 годзе ён паехаў вучыцца ў Нясвіжскую семінарыю. Тут у 1904 годзе памёр бацька, – расказвае Вольга Шавель.

Крынічка, якая аддзяляе Альбуць ад астатняга свету, – як сімвал яе адасобленасці. У Акінчыцах быў засценак, жылі людзі. У Альбуці, апрача Міцкевічаў, не было нікога. Да найбліжэйшага жытла – Акінчыц – дзве вярсты па прамой.

– Леснічоўка была надта маленькая. Ганна Юр'еўна плакала: пасля Ластка тут так змрочна, хаціна ўрасла вокнамі ў зямлю, і падлога земляная.

Не было шчасця, дык няшчасце памагло. Увесну 1891 года хата згарэла, і пабудавалі новую, з драўлянай падлогай.

Цяпер замест той хаты вельмі падобная, адбудаваная ў 1990 годзе, хоць і выглядае яна дзякуючы майстэрству рэстаўратараў вельмі старой.

Унутры амаль такая, як у Акінчыцах, хіба што багацейшая, дый на вокнах рознакаляровыя навамодныя вітражы з адлюстраваннем чатырох пораў года. І да кожнага ўрывак з Якуба Коласа. Напрыклад, на восень у жоўтым колеры:

І люб і смуцен час прыгоды,
Калі душа ўсяе прыроды
З тваёю злучыцца душою
Ў адным суладдзі і настрої!

Не ўпэўнена, што ідэя мне падабаецца, бо вітражы разбураюць атмасферу дома, пазбаўляюць яго сялянскай адметнасці і ўтульнасці.

Рэчы ў хаце, паводле слоў навуковага супрацоўніка Вольгі Шавель, збольшага падараваныя сваякамі і суседзямі Міцкевічаў. Збаночкі, глячкі, маслабойка.

Вось санкі, якія змайстраваў дзядзька Антось. Кубелец.

– Міхал увесь час завіхаўся ў лесе, а справы па гаспадарцы рабіў Антось, – падкрэслівае Копач.

Ад Антосевых вырабаў напраўду прамянее нейкая асаблівая энергетыка. Хаця ў хаце шмат цікавых прадметаў, на якія глядзіш са шчырым захапленнем.

Вось казачкі (боцікі) Ганны Юр'еўны, з першага погляду вельмі падобныя да сучасных.

– Гэта святочны абутак, да царквы хадзіць, – тлумачыць Шавель.

– Найцікавейшае ў гэтых казачках, – удакладняе Копач, – што яны падбітыя драўлянымі цвікамі.

– А вось боты, – паказвае Вольга Мікалаеўна. – Перадаваліся ад бацькі да сына. Ішлі босыя да кірмашу, а там ужо надзявалі боты.

***«Колас з тугой пісаў напрыканцы жыцця: «Самыя шчаслівыя гады майго дзяцінства і ўсяго жыцця прайшлі ў Альбуці».***

Хусткі, кажухі, плюшаўка Ганны Юр'еўны – яшчэ памятаю, як такую верхнюю вопратку насілі старыя жанчыны ў вёсках. Леснікова торба і компас.

– Кожныя пяць гадоў леснікоў пераводзілі на іншае месца, – расказвае Анатоль Копач. – Вось толькі ў Альбуці Міцкевічы затрымаліся.

– Чаму пераводзілі?

– Каб не прадаваў лес знаёмым сялянам.

– Наконт Міхала Казіміравіча, – з відавочным гонарам кажа экскурсаводка. – Пішуць, што ён быў вельмі добры служака, і калі ў нейкай акрузе не ладзілася, яго туды пераводзілі, каб навёў парадак.

– Справа яшчэ ў тым, што па Нёмане сплаўлялі лес за мяжу, – працягвае Анатоль Копач. – А тут сасновыя бары, прыдатны лес нават для будаўніцтва караблёў. Радзівілы добрыя грошы на гэтым мелі. Дваццаць-пяцьдзясят плытоў разам звязвалі, плытагоны на іх жылі, спалі, кухарылі. Даплывалі да Прусаў, а вярталіся пешшу. Можна было цягніком даехаць да Стоўбцаў, але вельмі дарага.

Міцкевічам хапала грошай, каб карыстацца чыгункай. Захаваўся нават чыгуначны ліхтар, які падаравалі дзядзьку Антосю, калі той ездзіў у Вільню.

– Ваўкі былі, ды і цяпер ёсць. У Стоўбцах на станцыі працаваў сцэпшчык Уласік, ён даў Антосю той ліхтар, каб не страшна было праз цёмны лес вяртацца дадому.

Пра ваўкоў дагэтуль на Стаўбцоўшчыне расказваюць розныя гісторыі. Нібыта ў райцэнтры шалёны воўк пакусаў людзей, а ў вёсцы Ругаец ледзь кола ад трактара не адгрыз. Што тады казаць пра даўнія часы, калі звяроў было значна болей?

– Колас з тугой пісаў напрыканцы жыцця: «Самыя шчаслівыя гады майго дзяцінства і ўсяго жыцця прайшлі ў Альбуці», – кажа Вольга Шавель.

Шчасце, воля, прырода, подых якой адчуваецца тут на кожным кроку.

На развітанне Анатоль Іванавіч паказаў нам сляды барсучых кіпцюроў. Звяры падыходзяць зусім блізка да сядзібы. Бачыў ён тут і рысей, куніц і розных іншых звяроў.

– Адметнасць прыроды? Ды хто б звяртаў увагу на яе, калі б на гэтай зямлі не нарадзіўся Колас? – разважае Вольга Шавель. – Зарасло б усё лесам. А так столькі працы ўкладваецца, каб паказаць людзям гэтую прыгажосць.

Цяжка не пагадзіцца.

## Смольня: моц духу

Апошні пункт нашага падарожжа. Пра Смольню сёлета шмат пісалі. У жніўні тут святкавалі 110-годдзе першай сустрэчы Купалы і Коласа, яна адбылася менавіта ў Смольні.

Зрэшты, Колас тут падоўгу не жыў. Прыязджаючы на вакацыі, бавіў час пераважна ў Мікалаеўшчыне, дзе жылі дзядзькі ды браты. Нават калі да яго завітаў Купала, маці паслала сястру, каб тая прывяла яго ў Смольню.

*«З дрэў, пасаджаных рукамі паэта, засталася толькі ліпа».*

У 1908 годзе Ганна Юр'еўна выкупіла ў Мікалаеўшчыне карчму.

– Карчмар Мойша паехаў у Еўропу шукаць лепшай долі, і яна стаяла пустой, – расказвае Вольга



«Купіць зямлю, прыдбаць свой кут...»



**«Калі красёнцы жыццЯ ткалі…»**

Шавель. – Ганна Юр’еўна з малодшымі дзецьмі і з дзядзькам Антосем з дазволу Радзівілаў тут пасяліліся. У Смольні быў участак зямлі, які належаў карчме, і Антось яго апрацоўваў.

Назва «Смольня», як лічыць Вольга Мікалаеўна, мае свой канкрэтны сэнс:

– Тут смалу здабывалі. Смалярняў такіх было шмат у лясах. Выпілоўвалі лес, а потым карчы палілі і смалу рабілі.

У 1910 годзе Мікалаеўшчыну знішчыў пажар, карчма таксама згарэла, і сям’я ізноў засталася без даху над галавой.

– Тады дзядзька Антось паехаў да Радзівілаў і папрасіў дазволу пабудавацца ў Смольні, – працягвае навуковы супрацоўнік. – Маўляў, бацька гэтых дзяцей усё жыццё верай і праўдай служыў Радзівілам, і цяпер час ім дапамагчы.

Да гонару Антона Радзівіла, ён дазволіў разабраць старую школу, што пуставала ў суседняй вёсцы Яршы, і пабудаваць з яе хату ў Смольні.

Зрэшты, гэта доўгая і складаная гісторыя, што непарыўна звязана з прыватнымі справамі сям’і. Дастаткова сказаць, што, вярнуўшыся ў 1911 годзе з турмы, Колас з дзядзькам Антосем прынеслі з лесу клёнікаў, рабін, ліп і пасадзілі каля хаты.

– З дрэў, пасаджаных рукамі паэта, засталася толькі ліпа, – паказвае экскурсавод.

Агромністае, высачэзнае дрэва як можа трымае цяжар сваёй вагі і сваіх 111 гадоў. Без пільнага нагляду спецыялістаў яно наўрад ці дажыло б да сённяшняга дня.

Праўнучатая пляменніца паэта – адна з галінак магутнага Коласавага дрэва – дагэтуль жыве ў Смольні, а калісьці тут з сям’ёй жыў Юзік – Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч, малодшы Коласаў брат.

У Смольні ёсць мемарыяльная хата, нечым падобная і да Акінчыц, і да Альбуці, а таксама літаратурны музей, яго адкрылі ў 1967 годзе. Тут можна вывучаць біяграфію паэта.

Найбольш прыкметны экспанат – драўляны помнік паэту, які стварыў народны майстар Канстанцін Мацвеевіч Саломка. Кажуць, калі патрымаць за руку Коласа, будзе ўдача і шчасце.

Калі сур’ёзна, дык Смольня – гэта каўчэг, што выратаваў значную частку сям’і ў цяжкія гады войнаў і акупацый. У міжваенны перыяд Смольня апынулася пад Польшчай, і доўгі час Колас быў разлучаны з зямлёй свайго дзяцінства, з блізкімі і роднымі людзьмі.

Яшчэ ў 1917 годзе памёр ад іспанкі дзядзька Антось. У 1929 годзе (таксама ў Смольні) памерла матуля. Колас не быў і не мог быць на яе пахаванні.

Можна толькі ўявіць, з якімі пачуццямі паэт праязджаў у 1935 годзе праз станцыю Стоўбцы, калі дабіраўся ў Парыж на сусветны кангрэс «Працаўнікі культуры ў абарону міру».

І менавіта Смольня стала адной з апошніх мясцін, якія ён наведаў перад смерцю. Ён быў тут 30 красавіка 1956 года ў брата. Ці расла тады ля хаты фантастычна прыгожая каліна, ад якой немагчыма адарваць позірк? Ці тая ж шыпшына, відаць, вельмі прыгожая ўлетку.

«Трэба будзе абавязкова вярнуцца і паглядзець на яе», – з такой думкай ехала дадому, развітаўшыся ў Акінчыцах з гасціннай і абаяльнай Вольгай Шавель.

***Юлія АНДРЭЕВА***
***Фота Паўла АРЛОЎСКАГА***
***Мінск – Акінчыцы – Альбуць – Смольня – Мінск***